View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**А.С.Васілеўская** (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка)

# ТАПОНІМЫ Ў АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА “ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА”

Разуменне мастацкага тэксту немагчыма без аналізу часу і прасторы, у якіх адбываецца дзеянне. Нярэдка сродкам стварэння хранатопу ў творы становяцца тапонімы [1]. Асабліва выразна такая функцыя геаграфічных назваў выяўляецца ў гістарычных творах. Не з’яўляецца выключэннем аповесць У.Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”, у якой ужываецца каля 50 розных геаграфічных назваў. Так, адзін з найбольш частотных тапонімаў у тэксце – назва ***Беларусь*** (намі налічана 11 ужыванняў) – дазваляе акрэсліць месца дзеяння: *Наступны дзень быў звычайным шэрым днём, якія часта бываюць увосень у* ***Беларусі*** [2, с. 29]. А ўжыванне ў творы назваў ***Расійская імперыя*** і ***Паўночна-Заходні край*** дае пэўнае ўяўленне пра час: *Гэта – дзействіе ўгалоўна наказуемае, іба какурат супярэчыць норавам нашага наваколля, а такжа і зводам законаў* ***імперыі Расійскай*** [2, с. 151]; ***Паўночна-Заходні край*** *як паняцце – фікцыя* [2, с. 169].

Асаблівасцю гэтай аповесці, як і іншых твораў У.Караткевіча, з’яўляецца тое, што яе нельга цалкам аднесці да гістарычнага жанру. Сам пісьменнік казаў: “Стапрацэнтных гістарычных твораў у мяне няма… Мяне цікавіць не гісторыя-сапраўднасць, а гісторыя-анекдот, гісторыя-прытча” [3, с. 146]. На думку даследчыкаў, У.Караткевіч “не апісвае вяршынныя падзеі, не партрэтызуе праслаўленых асоб. Наадварот, ён чэрпае матэрыял, яўна пабочны, з легенд, старых хронік і народных паданняў. Невядомыя, як правіла, выдуманыя героі і падзеі з глухіх, перыферыйных закуткаў служаць яму сыравінай, з якой ён стварае тыпы і выклікае ўяўленне духу беларускай народнай гісторыі” [3, с. 189-190].

Асаблівасць адлюстравання падзей, а таксама жанр гістарычнага дэтэктыва істотна ўплываюць на тапанімічную прастору аповесці.

Традыцыйна у працах, прысвечаных тапанімікону мастацкага твора, геаграфічныя назвы размяжоўваюцца на рэальныя і нерэальныя. У аповесці неаднаразова ўжываюцца назвы рэальных геаграфічных аб’ектаў: ***Вільня, Койданава, Крычаў, Мінск*** і інш. Разам з тым, у творы выкарыстаны айконімы і мікратапонімы, тыпу ***Жабічы, Ліпічна, Дубрава*** і пад., якія адпавядаюць тапанімічнай сістэме Беларусі, таму падаецца верагодным існаванне такіх тапонімаў у “глухіх, перыферыйных закутках” нашай краіны.

Ядро тапанімічнай прасторы аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” складаюць уласныя імёны, якія непасрэдна апісваюць месца дзеяння. Варта адзначыць, што месца на карце, дзе знаходзяцца Балотныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яліны, акрэслена дастаткова агульна: *Я ехаў з губернскага горада **М.** у самы глухі куток губерні...* [2, с. 6], *Такі быў той час, калі я ехаў на экспедыцыю ў глухі **Н-скі** павет губерні* [2, с. 9]. Аднак сама тапаграфія месца дзеяння выпісана вельмі дакладна: ***Балотныя Яліны, Волатава прорва, Яноўская пушча*** і інш.: — *Вы ў маёнтку **Балотныя Яліны*** [2, с. 18]; *Я ішоў краем **Волатавай прорвы**, і воку літаральна не было на чым адпачыць* [2, с. 107]; *Наступнага дня я ішоў са Свеціловічам да невялікага ляснога вострава ля **Яноўскай пушчы*** [2, с. 123].

Практычна ўсе гэтыя назвы двухкампанентныя паводле структуры: утвараюцца з агульнага назоўніка і прыметніка: ***Халодная лагчына, Хаданоўская пушча, Ведзьмакова ступа:*** *Вырашылі, што Рыгор будзе сённяшняй ноччу сядзець у **Халоднай лагчыне…*** [2, с. 127]; *Тут, у **Хаданоўскай пушчы**, сядзеў кульгавы бацька Яраш Штамет…* [2, с. 43], — *Ля Халоднай лагчыны, дзе ляжыць камень, **Ведзьмакова ступа*** [2, с. 126].

Тапонімы з'яўляюцца матываванымі, ствараюць дакладныя прасторавыя арыенціры, каб дакладна, прадметна апісаць месца дзеяння, што вельмі важна дла раскрыцця загадкі дзікага палявання.

Адначасова назвы тыпу ***Халодная лагчына, Ведзьмакова ступа*** дазваляюць аўтару стварыць таямнічы і міфічны фон для незвычайных падзей аповесці.

Назвы, што знаходзяцца на перыферыі тапанімічнай прасторы аповесці, выконваюць самыя разнастайныя функцыі, якія не абмяжоўваюцца задачамі акрэслення месца і часу.

Так, ужыванне назваў геаграфічных аб'ектаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, дазваляюць перадаць любоў галоўнага героя да сваёй зямлі, выказаць адносіны да таго, што адбываецца на радзіме: *Гэта была візантыйская **Беларусь*** [2, с. 8]; *Няшчасная **Беларусь**! Добры, памяркоўны, рамантычны народ у руках такой поскудзі* [2, с. 72]; *Можа, цёплыя агні вёсак, назвы якіх і дагэтуль нейкім цёплым болем уваходзяць у маё сэрца: **Ліпічна, Сорак Татар, Бярозава Воля,** урочышча **Разбіты Рог, Памярэч, Дубрава, Вавёркі?*** [2, с. 8].

З розным функцыянальным прызначэннем выкарыстоўваюцца ў тэксце назвы іншых краін і гарадоў. Напрыклад, яны дазваляюць стварыць кантраст паміж неабсяжнай прасторай свету і маленькім абсягам Балотных Ялін: *– Скажыце, гэта вялікія гарады, **Вільня** і **Мінск**? – Даволі вялікія. Але **Масква**, **Пецярбург** большыя. – А што, там таксама людзям нядобра ўночы?* [2, с. 27].

Тапонімы становяцца сродкамі стварэння іроніі: *Размаўляла дама з самым сапраўдным французскім пранонсам, які, як вядома, захаваўся на зямлі толькі ў дзвюх мясцінах: у салонах **Парыжа** і ў засценку **Кабыляны** пад **Оршай*** [2, с. 56]. Іранічны эфект дасягаецца ўвядзеннем у адзін кантэкст назваў ***Парыж*** і ***Кабыляны***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сустракаецца ў тэксце і такі стылістычны прыём, як антанамазія – замена агульнага імя ўласным: *І ўсё ж нават гэта было* ***Італіяй*** *у параўнанні з тым, што мы пабачылі праз два дні* [2, с. 11]. У кантэксце назва краіны абазначае светлы сонечны край.

Уласныя геаграфічныя назвы выступаюць сродкамі стварэння падтэксту: *Прапаведавалі б нам гэтую тэорыю да пачатку гэтага стагоддзя – абавязкова б Беларусь перашыбла* ***Германію****, а беларусы зрабіліся б першымі гвалтаўнікамі на зямлі і пайшлі б адваёўваць у рускіх, якія не сапраўды рускія, жыццёвы абшар, асабліва яшчэ калі б добры Божачка даў нам рогі* [2, с.7]. Разуменне гэтага сказа немагчыма без ведання гісторыі Германіі XIX ст., часу, калі гэтая краіна ператвараецца ў магутную ваяўнічую дзяржаву.

Уяўленне пра далейшы лёс галоўнага героя дае наступны сказ: *Нам было добра паўсюль, нават у* ***Сібіры****, куды я трапіў у 1902 годзе* [2, с. 197]. Увядзенне тапоніма ***Сібір*** дае магчымасць меркаваць пра ссылку, якую адбыў Андрэй Беларэцкі.

Такім чынам, тапонімы ў аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” дазваляюць не толькі акрэсліць прастору і час, у якіх адбываецца дзеянне, але і арганічна ўваходзяць у вобразную сістэму твора, цесна звязваюцца з жанрам і сюжэтам тэксту, перадаюць як фактычную, так канцэптульную і падтэкставую інфармацыю.

**Літаратура**


1. Имя собственное в художественном тексте : учебн.-метод. пособие / автор-составитель А.Н.Деревяго. – Витебск: УО «ВГУ им. П.М.Машерова”, 2008. – 195 с.
2. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха / У.Караткевіч // Збор твораў : у 8 т. Т. 7. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – С. 5-197.
3. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : партрэт пісьменніка і чалавека / А.Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 230 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ